УДК 821.161.3-1

# КАНЦЭПТ *КАХАННЕ* ЯК СРОДАК АКТУАЛІЗАЦЫІ ПАЭТЫЧНАГА ТЭКСТУ (на матэрыяле твораў беларускай жаночай паэзіі)

**Л.М. Мазуркевіч, В.А. Рубанава**
(Мазыр, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны вызначэнню вобразна-выяўленчай ролі канцэпту каханне ў паэтычных тэкстах Н. Мацяш, Г. Каржанеўскай, Я. Янішчыц, Р. Баравіковай*

Паняційнае ядро канцэпту *каханне* акружана пэўнымі асацыятыўнымі значэннямі, большасць з якіх мае метафарычны змест. Метафарычны падыход прадугледжвае параўнанне нейкай эмоцыі на падобныя да яе з‟явы. У лірычных вершах каханне традыцыйна прадстаўлена актыўным суб‟ектам дзеяння, якому ўласцівы чалавечыя якасці. Яно можа дзесьці жыць, ісці, бегчы або затаіцца, спаць, вітаць чалавека або падманваць яго, кіраваць чалавекам або служыць яму, адорваць яго ці нечага пазбаўляць: *Ты пакліч мяне. Пазаві. / Там заблудзімся ў хмельных травах. / Пачынаецца ўсе з любві, / Нават самая простая ява…* [1, 31]; *Сама вясна з'яднала нашы душы, / Сама любоў нас вынесла з агню. / … І ўсѐ ж баюся я радком парушыць / І разбурыць між намі цішыню…* [1, 70]; *А быў пасаг мой не зусім заможны: / Вось толькі крылы лѐгкіх рук і броў. / У самы смутны час, у час трывожны / Ўзыдзі, любоў…* [1, 118]; *Баюся я нявыказаных слоў, / Яны – палын, яны дурман і мята. / Прыходзіць позна лепшая любоў, / Як за пакуты горкія адплата…* [1, 174]; *Гэта верасень блытае зноў / са спякотаю мокрую навісь, / бо калі адыходзіць любоў / прачынаецца злая нянавісць…* [2, 74]; *Якім ты ѐсць і стаць якім гатовы, – / Хай светлай будзе лѐсу каляя! – / Ад злой няўдачы, ад ліхой намовы / Хай беражэ цябе любоў мая…* [3, 114]; *Укрый мяне, любоў мая, / Хоць позіркам замілаваным…* [4, 213]; *Трывожнае, трывушчае ты, / Сэрца, / Цябе, / Нібы стыхія першабытная, / смяротна перапоўніць пачуццѐ цябе…* [5, 86]. Каханне можа мець і ўзрост: *І толькі восенню імглістай / Жыве мая душа наноў, / Калі з курлыканнем і свістам / Адносіць юную любоў…* [1, 168]; *Ну як табе пад інеем, вяргіня, / ты нібы радасць позняга кахання, / а вось жа кажа: святамі пакіне, / бы абяцае раніцы змярканне…* [2, 163]; *Вось гэтак жа з глыбінь гадоў, / пад пераліў залітнай пташкі, / між дрэў бялюткаю рубашкай / азвецца першая любоў…* [6, 159].

Вобразы, якія паўстаюць перад чытачом у лірычных вершах, абумоўлены, перш за ўсѐ, гендарнымі характарыстыкамі, бо жаночая душа поўніцца такімі эмоцыямі, якія мужчына з-за прыроднай стрыманасці і прагматычнага складу свайго характару не здолее так умела і дакладна перадаць. Так, каханне прыпадабняецца паэткамі да вадкасці, якую яны прагнуць паспрабаваць, каб наталіць пачуццѐвую смагу: *Любві не наталіць / скупой дажджынкай дня. / А жыць – пакуль баліць / На сэрцы вышыня…* [1, 101]; *Яна адна тут, ясная крыніца. / Цяпер ты і не думаеш, бадай, / Што толькі ў ѐй адзінай і бруіцца / Жыццѐ, якім гаворыць з намі гай… / Любоў… Яна – як гэтая крыніца…* [3, 24]; *Гэты снег, як маѐ каханне, / Як шчасце наша: Праз месяц, бадай, растане / І зноўку ляжа…* [7, 140]; *Як рака на лузе завіваецца, / Так настрой / майго каханага / мяняецца / То ласкавы ѐн, / акрылены без меры, / то зняверany, / як раб каля галеры…* [8, 24]; *Відаць, рака маей любові / Абмялела, / І*

МГПУ им. И.П. Шамякина

*горкія адплата…* [1, 174]; *Прывязацца б душою і целам, / вочы б сінія прагна любіць / колькі помню сябе – ўсѐ хацела / я жанчынаю вернаю быць…* [2, 139].

У поўнай меры ацаніць набытае пачуццѐ – сваѐ каханне – можа толькі той, хто заслужыў такі падарунак сваімі пражытымі мінулымі пакутамі і праблемамі: *Як вераломн – спрэс! – цвітуць сады, / Што і гаркоты больш не заўважаю… / Чакаю – скрозь! Чакаю – назаўжды / таго, каго любіла і кахаю…* [1, 230]; *За мукі, за страты – любоў. / Прымі падарунак, не грэбуй, / Тым болей не скардзіся небу / На лютасць ягоных грамоў…* [7, 242]; *Не зусім была і жаданая, / вінаваты шал капяжоў, / а я хацела ж быць каханаю, / а чакалася ж – не ішоў!* [6, 190]; *І трачу на спрэчкі хвіліны, / І сэрца тыраню праз дым, / Хоць знаю, ніхто не павінны / У трудным каханні маім…* [1, 181], *Ну як табе пад інеем, вяргіня, / ты нібы радасць позняга кахання / а вось жа кажа: святамі пакіне, / бы абяцае раніцы змярканне…* [2, 163]; *І толькі восенню імглістай / Жыве мая душа наноў, / Калі з курлыканнем і свістам / Адносіць юную любоў…* [1, 168]; *Баюся я нявыказаных слоў, / Яны – палын, яны дурман і мята. / Прыходзіць позна лепшая любоў, / Як за пакуты горкія адплата…* [1, 174].

Такім чынам, у свядомасці сучаснай жанчыны канцэпт *каханне* рэалізуе адзінства традыцыйных і сучасных уяўленняў, якія ўзаемадзейнічаюць або супрацьстаяць адно другому. Ядро канцэпту ў лірычных вершах утвараюць тыповыя прыкметы, вербалізаваныя разнастайнымі вобразамі, звязанымі з уяўленнямі пра каханне. Вобразы кахання могуць мець характар агульнавядомых і зразумелых (персаніфікацыя кахання, прыпадабненне да свету, вады і г. д.), а таксама індывідуальна-аўтарскіх, якія не сустракаюцца ў звыклых апісаннях гэтага пачуцця.

**Літаратура**


1. Янішчыц, Я. Выбранае / Я. Янішчыц. – Мінск: Выш. школа, 1998. – 271 с.
2. Баравікова, Р. Пад небам першага спаткання: лірыка / Р. Баравікова. – Мінск: Маст. літаратура, 1990. – 174 с.
3. Мацяш, Н. Паварот на лета: вершы, паэмы / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літаратура, 1986. – 158 с.
4. Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой. Вершы і паэмы (1962–1992) / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літаратура, 1993. – 301 с.
5. Мацяш, Н. Душою з небам гаварыць: выбр. лірыка / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літаратура, 1999. – 462 с.
6. Баравікова, Р. Дрэва райскай птушкі: лірыка / Р. Баравікова. – Мінск: Маст. літаратура, 2007. – 270 с.
7. Каржанеўская, Г. Невымоўнае: вершы / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літаратура, 1991. – 287 с.
8. Каржанеўская, Г. Асенні мѐд: вершы розных гадоў / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літаратура, 1999. – 159 с.
9. Мацяш, Н. Богава дрэва: вершы / Н. Мацяш. – Мінск: Про Хрысто, 2004. – 68 с.


МГПУ им. И.П.Шамякина